Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 КРАСАВІКА 2018 г. ЧАЦВЕР № 70 (28686)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Транспланталогія як крытэрый чалавекалюбства

СТАР. 4

Сямейная газета

Валянціна Навіцкая пра дзяцей

Права таты

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр КУЛІК, першы намеснік Міністра лясной гаспадаркі:

«29 тысяч гектараў новых лясоў плануецца пасадзіць у краіне ў 2018 годзе. Гэтыя работы пачаліся. Ужо пасаджана больш за 1 тысячу гектараў новых лясоў — у Брэсцкай і Гомельскай абласцях. Традыцыйна ў перыяд вясновых пасадак праходзіць акцыя «Тыдзень лесу». Сёлета яна адбудзецца з 14 па 21 красавіка і будзе прысвечана Году малой радзімы. Усе жадаючыя змогуць прыняць у ёй удзел. Для гэтага неабходна звярнуцца ў бліжэйшы лясгас або лясніцтва. Спецыялісты не толькі вызначаць месца і від працы, але і забяспечаць неабходным інвентаром, пасадачным матэрыялам. Галоўная мэта мерапрыемства — прыцягненне шырокай увагі грамадскасці да праблем ляснога фонду, папулярызацыя беражлівых адносін да аднаго з галоўных прыродных рэсурсаў краіны. Акцыя праводзіцца ў 11-ы раз».

ISSN 1990 - 763X

ДВА ВОЛАТЫ

Гаспадаркі Зэльвенскага раёна прыступілі да сяўбы яравых зерневых культур. *На здымку:* механізатар КСУП «Галынка» Аляксандр КУЛІК.

Фота БЕЛТА.

■ Жыццё вялікага горада

МАРЫ ПРА ЛІПЫ

Як дрэвам выжыць у гарадскім асяроддзі?

Усе мы не раз чулі выраз: лясы — лёгкія нашай планеты. У гэтым выпадку паркі, скверы і нават алеі — лёгкія горада. На жаль, у Мінска гэты «орган» не зусім здаровы. Аднак спецыялісты не пакідаюць надзеі вярнуць яму былую сілу. Чарговая спроба — высадка 170 ліп уздоўж праспекта Незалежнасці.

Другая група

Аднак жаданне палепшыць экалагічную сітуацыю ў горадзе — не адзіная прычына такога рашэння. З мінулага лютага галоўная магістраль сталіцы прэтэндуе на ўнясенне ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ў катэгорыі «Пасляваенная сацыялістычная архітэктура краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы». Паколькі ў 1940-я гады тут высаджвалі ліпы, было прынята рашэнне вярнуць менавіта гэтую пароду дрэў.

Так, каля дзвюх сотняў ліп плануюць высадзіць у наступныя два-тры тыдні, каб паспець да роспуску пупышак. Як расказала **кіраўнік службы па добраўпарадкаванні і ўтрыманні аб'ектаў зялёнай гаспадаркі УП «Мінскзелянбуд» Анжаліка ПУЗАНКОВА**, звычайна ў Мінску высаджваюць дрэвы другой групы, але гэтым разам спыніліся на тых, што бліжэй да трэцяй — больш буйных. У іх таўсцейшая кара, што, магчыма, дапаможа дрэвам не так пакутаваць ад уздзеяння соляў. Пры гэтым трэцяя група прыжываецца не так добра, як другая.

СТАР. 3

Аказваецца, высадка «дарослых» дрэў была асвоена яшчэ як мінімум шэсцьдзясят гадоў таму.

КОРАТКА

Да 100 маладых афіцэраў запасу прызавуць у 2018 годзе на службу ва Узброеныя Сілы Беларусі. Гэта прадугледжана Указам № 134 «Аб прызыве афіцэраў запасу на ваенную службу», які Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 11 красавіка.

Прэм'ера музычнага спектакля «Плошча Якуба Коласа» стане адным з галоўных мерапрыемстваў 34-га фестывалю «Мінская вясна», які пройдзе з 12 красавіка па 19 мая. Гэты твор сучаснага кампазітара Ларысы Сімаковіч напісаны да 135-годдзя з дня нараджэння беларускага песняра.

Аграрыі Магілёўскай вобласці пачалі сяўбу яравых збожжавых культур. Першымі ў поле выйшлі аграрыі ў Бабруйскім, Глускім, Быхаўскім, Краснапольскім і Слаўгарадскім раёнах. Сеялкі выйшлі ў поле Чашніцкага і Пастаўскага раёнаў на Віцебшчыне.

Тры беларускія ВНУ ўвайшлі ў сусветны рэйтынг Round University Rankings: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (706-е месца), Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы (731-е) і Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт (772-е). Тройку лідараў склалі Гарвардскі ўніверсітэт, універсітэт Чыкага і Каліфарнійскі тэхналагічны інстытут.

■ Ва ўрадзе

Залежнасць знізілася. Але недастаткова

На рынак Расіі даводзіцца 38,2 % беларускага экспарту

Прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ патрабуе больш актыўнага вырашэння задач па дыверсіфікацыі экспарту і развіцці паслуг. Адпаведнае даручэнне кіраўнік урада даў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, дзе абмеркавалі ход рэалізацыі Нацыянальнай праграмы падтрымкі і развіцця экспарту Беларусі на 2016—2020 гады.

Андрэй Кабякоў звярнуў увагу, што пэўныя станоўчыя вынікі ў экспарце на гэтым этапе дасягнуты. У 2017 годзе і пачатку 2018-га экспарт упершыню з 2012 года выйшаў на траекторыю ўстойлівага росту. У студзені — лютым 2018 года ён вырас на 29,8 % да $6,185 млрд, забяспечана дадатнае знешнегандлёвае сальда ў памеры $206 млн.

Экспарт тавараў павялічыўся як за кошт росту сярэдніх цэн, так і ў фізічным выражэнні. Атрыманыя вынікі адпавядаюць параметрам, зацверджаным пяцігадовай праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. «Гэтаму садзейнічала і спрыяльная кан'юнктура на сыравінным рынку і на рынках краін — асноўных гандлёвых партнёраў. Разам з тым не ўсе задачы, прадугледжаныя нацыянальнай праграмай, вырашаны, перш за ўсё ў частцы геаграфічнай дыверсіфікацыі і развіцця экспарту паслуг», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Што датычыцца дыверсіфікацыі, то канцэнтрацыя экспарту на рынках пяці краін — асноўных гандлёвых партнёраў застаецца вышэйшай за сярэднюю. У студзені — лютым 2018 года на рынкі гэтых краін прыпадала амаль 71 % экспарту, хоць залежнасць ад рынку Расіі знізілася. У студзені — лютым 2018 года, нягледзячы на агульны рост экспарту ў Расію амаль на $200 млн, удзельная вага экспарту ў гэтую краіну склала 38,2 % (зменшылася на сем працэнтных пунктаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года).

Гаворачы аб таварнай дыверсіфікацыі на прыкладзе экспарту ў Еўрапейскі саюз, Андрэй Кабякоў звярнуў увагу, што Беларусь пастаўляе ў ЕС даволі вузкую гаму тавараў, значную долю (каля 50 %) займаюць прадукты нафтаперапрацоўкі. «Высокая канцэнтрацыя на рынак адной ці некалькіх краін або на вузкай гаме тавараў фарміруе для нашай краіны значныя рызыкі. Гэтыя рызыкі неабходна мінімізаваць», — падкрэсліў кіраўнік урада.

На думку прэм'ер-міністра, значны патэнцыял мае экспарт паслуг. Нацыянальнай праграмай падтрымкі і развіцця экспарту Беларусі на 2016—2020 гады ўстаноўлена, што сёлета экспарт паслуг у агульным аб'ёме павінен скласці не менш як 23 %. У 2017 годзе гэты паказчык быў на ўзроўні 21,4 %, у студзені — лютым 2018-га — толькі 19,4 %. Асноўная доля ў экспарце паслуг у 2017 годзе прыпадала на транспартныя (44,4 % ад агульнага аб'ёму). Доля камунікацыйных, камп'ютарных, інфармацыйных паслуг у экспарце склала амаль 19 %. Таму на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна абмяркоўвалася, як будуць павялічвацца аб'ёмы экспарту іншых відаў паслуг — турыстычных, адукацыйных, медыцынскіх і г. д.

Урад таксама вывучыць прапановы па стымуляванні экспарту малога і сярэдняга бізнесу. Па даручэнні Андрэя Кабякова іх падрыхтоўкай зоймуцца Міністэрства замежных спраў і Міністэрства эканомікі. «Мы маем вялікі патэнцыял па нарошчванні экспарту суб'ектамі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Гэты патэнцыял трэба актыўна развіваць, ён з'яўляецца адным з прыярытэтаў нацыянальнай праграмы», — адзначыў Андрэй Кабякоў.

Доля малога і сярэдняга бізнесу ў несыравінным экспарце тавараў у 2017 годзе склала 28,4 %, і ўрад ставіць задачу нарасціць яе да 2020 года мінімум на пяць працэнтаў. З улікам гэтага кіраўнік урада даручыў МЗС і Мінэканомікі больш актыўна прыцягваць малы і сярэдні бізнес да вырашэння задач па росце экспарту, а таксама ўнесці ва ўрад прапановы па далейшым стымуляванні экспарту малога і сярэдняга бізнесу і зняцці магчымых бар'ераў.

Паводле БЕЛТА

■ Парламенцкі дзённік

КОДЭКСЫ І ВЫБАРЫ

Пра гэта і не толькі — у тыднёвым аглядзе падзей у Палаце прадстаўнікоў

Дэпутаты Леанід Брыч і Анатоль Дашко пачалі работу ў выбарчых акругах і **наведалі Брэсцкі абласны радзільны дом**. Галоўны ўрач Валерый Шугай расказаў, што на святочных выхадных у раддоме з'явіліся на свет чатыры дзяўчынкі і адзін хлопчык. Дэпутаты павіншавалі матуль, а старшыня «Белай Русі» Ленінскага раёна Брэста Таццяна Аўдзяйчук уручыла сертыфікаты дзіцячага гандлёвага цэнтра.

У аўторак Наталля Гуйвік, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве, удзельнічала ў **пасяджэнні Канстытуцыйнага суда Беларусі**, на якім разгледзелі справу аб праве на судовую абарону зацікаўленых асоб у загадным вядзенні (працэдура спагнання запазычанасці). Наталля Гуйвік лічыць, што заканадаўства мае прабел у частцы забеспячэння судовай абароны іншых асоб, правы і законныя інтарэсы якіх могуць быць закрануты пастановай аб судовым загадзе. Каб яго ліквідаваць, неабходна ўнесці змены ў Грамадзянскі і Гаспадарчы працэсуальныя кодэксы Беларусі.

Дзейнасць дэпутатаў за межамі нашай краіны на гэтым тыдні адзначана шэрагам падзей. У панядзелак — аўторак у Вялікіх Луках (Расія) прайшло **сумеснае пасяджэнне камісій Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі**. На ім разгледзелі пытанні распрацоўкі і рэалізацыі двухбаковых праграм і праектаў, а таксама гарманізацыі заканадаўства ў гандлёва-эканамічнай сферы. Дэпутаты сустрэліся з кіраўніцтвам Пскоўскай вобласці і горада Вялікія Лукі, а таксама наведалі завод электратэхнічнага абсталявання «ЗЭТА».

У Анкары з 10 па 12 красавіка праходзяць кансультацыі паміж Пастаяннай камісіяй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і Камісіяй па замежных справах Вялікага нацыянальнага сходу Турцыі па пытаннях міжнароднага супрацоўніцтва. Бакі абмяркоўваюць развіццё міжпарламенцкіх кантактаў, **паглыбленне беларуска-турэцкага супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай і гуманітарнай сферах**.

Таксама ў гэтыя дні Валянцін Міхневіч, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па нацыянальнай бяспецы, прымае ўдзел у міжнародным назіранні за **выбарамі прэзідэнта Азербайджана** ў складзе місіі назіральнікаў ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў па лініі Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД.

Надзея АНІСОВІЧ

■ Ёсць нагода

І ЗНОЎ ПАЕХАЛІ!

Сёння чарговая гадавіна першага палёту чалавека ў космас. І ў той час, пакуль многія, гледзячы ў неба, успамінаюць такога быццам роднага Юрыя Гагарына, у айчынных навуковых інстытутах і на прадпрыемствах думаюць пра запуск новага беларуска-расійскага спадарожніка.

Да 2019 года апарат знаходзіцца на этапе эскізнага праектавання. І толькі бліжэй да яго завяршэння будзе вядома, калі мы зможам запусціць новы спадарожнік у космас. Пакуль што ў нас ёсць свая «БКА» на арбіце. І за гады працы — нагадаем, што запусцілі спадарожнік у 2012-м, — знята больш за 120 млн кв. км, у тым ліку шматразова сфатаграфаваная тэрыторыя нашай краіны. Планавалася, што ён пралятае пяць гадоў, але зараз тэрмін эксплуатацыі плануюць працягнуць яшчэ на тры.

Новы апарат дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі будзе мець звышвысокае раздзяленне. То-бок на здымках спадарожніка 2012 года можна разгледзець дэталі, не меншыя за два метры, а тут плануюць усталяваць оптыку, якая дазволіць вызначаць аб'екты, нават не большыя за паўметра. Распрацоўвае такую «начынку» «Пеленг». Яго апаратура за гэтыя гады была ўсталявана на пяць спадарожнікаў, у тым ліку на два расійскія «Канопус-В», запушчаныя сёлета 1 лютага. Да канца года плануецца, што на арбіту выйдуць яшчэ два «Канопусы», запушчаныя з касмадрома «Усходні» з нашай оптыкай.

Варта нагадаць, што летась завяршылася беларуска-расійская праграма «Маніторынг-СГ». Падчас яе распрацавалі шэраг практычных рашэнняў для касмічнай галіны. Напрыклад, стварылі ўнікальны праграмна-апаратны комплекс для аналізу працэсу разгару ракетных рухавікоў на самым важным і цяжкім пачатковым этапе. Акрамя таго, працавалі над гіперспектральнай і радарнай апаратурай дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, комплексам для кантролю характарыстык вугляродных і графітных матэрыялаў вузлоў ракетных рухавікоў і іншымі праектамі. Увогуле беларускі бок за чатыры гады па праграме выканаў 49 заданняў.

Дарэчы, у верасні сустрэць сапраўднага касманаўта на сталічных вуліцах больш чым магчыма. Іх будзе ў Мінску каля 150! Прынамсі, столькі запрошана на 31-ы міжнародны кангрэс Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў. Праграма для ўдзельнікаў — а ўсяго гэта каля 350 чалавек — прадугледжвае пасяджэнні тэхнічных секцый і выстаўку касмічных тэхналогій, таксама яны выступяць перад прадстаўнікамі беларускіх арганізацый і ВНУ.

Надзея АНІСОВІЧ

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У АЛЖЫРЫ РАЗБІЎСЯ САМАЛЁТ

Самалёт ваенна-паветраных сіл Алжыра зваліўся ў раёне аэрапорта Буфарык правінцыі Бліда на поўначы Алжыра. Крушэнне адбылося ўсяго праз некалькі хвілін пасля ўзлёту. Відавочцы паведамляюць, што лайнер ляцеў на вельмі невялікай вышыні, у яго гарэў правы рухавік. На борце Іл-76 знаходзіліся 247 ваенных і дзесяць членаў экіпажа. Паводле папярэдняй інфармацыі, усе яны загінулі. **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка** ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Алжырскай Народнай Дэмакратычнай Рэспублікі Абдэльазізу Бутэфліку, народу гэтай краіны, а таксама родным і блізкім загінулых пры крушэнні ваеннага самалёта. *«У Рэспубліцы Беларусь з вялікім смуткам успрынялі паведамленне аб гібелі вайскоўцаў у выніку крушэння самалёта ваенна-паветраных сіл Алжыра. Гэта цяжкая страта для вашай краіны»*, — адзначаецца ў спачуванні.

СТРАТЫ ЎЛАДАЛЬНІКАЎ КРЫПТАВАЛЮТ У ВЫНІКУ ІХ КРАДЗЯЖОЎ СКЛАДАЮЦЬ $1,36 МЛРД

Па звестках расійскага Цэнтрабанка, з пачатку года ў свеце было здзейснена больш за 20 буйных ашуканскіх схем з выкарыстаннем лічбавых фінансавых актываў. Шкода ад крадзяжоў на сусветным рынку, звязаных з крыптавалютамі (непасрэдна крадзеж або ашуканскія ICO — прыцягненне інвестыцый у лічбавых актывах), склала $1,36 млрд, паведаміла кіраўнік дэпартамента фінансавых тэхналогій Банка Расіі Аліса Мельнікава. «З пачатку 2018 года ў свеце ажыццёўлены 22 буйныя ашуканскія схемы з выкарыстаннем лічбавых фінансавых актываў. Выкрадзена каля $1,36 млрд у крыптавалюце, або $23 млн у дзень. У студзені толькі з біржы CoinCheck выведзена больш за $420 млн», — адзначыла Мельнікава, спасылаючыся на наяўную статыстыку.

ШТОГОД НА ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАХ ПАМІРАЕ АМАЛЬ ТРЫ МІЛЬЁНЫ ЧАЛАВЕК

Каля 2,8 мільёна людзей у свеце штогод гіне на працоўных месцах, з-за гэтага штогод губляецца да 4 % глабальнага ВУП, заявіў генеральны сакратар Міжнароднай асацыяцыі сацыяльнага забеспячэння Ханс-Хорст Канкалеўскі. Па звестках асацыяцыі, вялікая частка смяротных выпадкаў на вытворчасці звязана з праблемамі са здароўем, менш за 15 % — з няшчаснымі выпадкамі. «Гэта сведчыць аб тым, што трэба ўдзяляць значна больш увагі пытанням здароўя, чым лічылася раней», — заявіў Канкалеўскі. Эксперт дадаў, што прафілактыка смерцяў на працоўных месцах павінна абапірацца на тры складнікі: бяспека, увага да стану здароўя і дабрабыт работнікаў.

ГІПОТЭЗА ПАХОДЖАННЯ ЛЮДЗЕЙ НЕ ПАЦВЯРДЖАЕЦЦА

Навукоўцы Оксфардскага ўніверсітэта (Англія) знайшлі астанкі, якія належаць старажытнаму чалавеку, за межамі Афрыкі і Леванта. Узрост знаходкі складае каля ста тысяч гадоў. Адкрыццё не пацвярджае здагадку аб тым, што асноўная хваля міграцыі людзей з Афрыкі пачалася 60 тысяч гадоў таму. Пра гэта паведамляе выданне Science Alert. Згодна з агульнапрынятай гіпотэзай, першыя Homo sapiens з'явіліся ў Афрыцы 200—400 тысяч гадоў таму. Лічыцца, што рассяленне людзей сучаснага тыпу з Чорнага кантынента пачалося 177 тысяч гадоў таму, калі яны прыйшлі на тэрыторыю Леванта, на ўсход ад Міжземнага мора. Людзі, якія жывуць цяпер у Еўразіі, Аўстраліі і Амерыцы, з'яўляюцца нашчадкамі тых, хто мігрыраваў 60 тысяч гадоў таму. Аднак нядаўнія археалагічныя знаходкі сведчаць аб тым, што Homo sapiens маглі трапіць у Еўразію яшчэ 120 тысяч гадоў таму.

■ На слыху

Курсы валют залежаць ад знешніх фактараў

Аналітыкі ўпэўнены: калі расійскі рубель не адновіцца, долар і ў нас значна падаражэе

Дынаміка курсаў валют у Беларусі на гэтым тыдні абумоўлена падзеямі ў Расіі. З-за пашырэння санкцый з боку ЗША расійскі рынак сутыкнуўся з уцёкамі капіталу, да якога, відавочна, дадалася і спекуляцыйная атака, лічыць фінансавы кансультант Жанна КУЛАКОВА. За два гандлёвыя дні расійскі рубель страціў да бівалютнага кошыка Цэнтрабанка Расіі 8,3 %, і падзенне пакуль працягваецца.

На рынку відавочна паніка, і пакуль яна не ўляжацца, цяжка з упэўненасцю прагназаваць, наколькі глыбокім акажацца падзенне. Аднак вельмі вялікая магчымасць, што неўзабаве пачнецца карэкцыя і расійскі рубель умацуецца. Тым больш што рэзка патаннелі акцыі і расійскі рубель — добрая нагода за невысокі кошт закупіцца каштоўнымі паперамі суседкі і яе валютай.

Магчымыя негатыўныя наступствы для валютнага рынку нашай краіны пакуль што згладжваюцца праз курс расійскага рубля — ён значна ўпаў. Па выніках таргоў, 10 красавіка курс расійскага рубля склаў 3,2507, і гэта самы нізкі ўзровень са жніўня 2017 года. Такое падзенне можа негатыўна адбіцца на экспарце — гандлёвая залежнасць Беларусі ад Расіі нікуды не знікла. З-за ўмацавання беларускага рубля да расійскага тавары беларускай вытворчасці даражэюць для Расіі. Гэта можа прывесці да скарачэння экспартнай выручкі і паслаблення беларускага рубля.

Магчыма, курс расійскага рубля ў Беларусі ў агляднай будучыні вернецца да адзнакі 3,4. Калі пры гэтым курс расійскага рубля ў Расіі застанецца на бягучых адзнаках, то курс долара ў Беларусі наблізіцца да адзнакі 2,1. Калі б не сённяшняе падзенне курса расійскага рубля, то долар ужо сёння каштаваў бы прыкладна столькі ж.

Калі расійскі рубель усё ж адкарэктуецца і курс долара ў Расіі ўпадзе з бягучых 63 да 60 рублёў, то курс «бакса» ў Беларусі можа вырасці прыкладна да 2,05 (пры ўмове вяртання курса расійскага рубля да адзнакі 3,4). Гэтыя разлікі актуальныя для бягучых суадносін еўра і долара (1,235).

«У любым выпадку не думаю, што беларусам варта разлічваць на хуткае вяртанне курса долара да адзнакі 1,95, — расійская эканоміка пацярпела з-за санкцый, і расійскі рубель яшчэ доўга застанецца больш слабым, чым быў усяго некалькі дзён таму», — упэўнена Жанна Кулакова.

Акрамя таго, важна разумець, што ў цяперашняй палітычнай сітуацыі геапалітычныя рызыкі для расійскага рубля будуць захоўвацца заўсёды. Некаторыя з іх вядомыя — напрыклад, цяпер у ЗША будзе разглядацца законапраект аб забароне на інвестыцыі ў расійскія аблігацыі. Калі яго прымуць — распродаж расійскіх актываў працягнецца (дарэчы, на руках нерэзідэнтаў знаходзіцца прыкладна трэць усіх выпушчаных аблігацый федэральнай пазыкі). Але дадзеная сітуацыя — хутчэй выключэнне з правілаў, часцей геапалітычныя фактары ўсплываюць нечакана, адбыцца гэта можа ў любы момант. Пра гэта трэба памятаць усім, для каго важныя курсы валют і ў нашай краіне, і ў Расіі.

Сяргей КУРКАЧ.

P.S. Па стане на 11 красавіка, долар за дзень яшчэ падаражэў на 4,4 капейкі, а еўра — на 7 капеек.

■

■ Фінансы

Інфляцыя ў сакавіку 0,8 %

Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў сакавіку ў параўнанні з лютым склаў 100,8 %, а са снежнем 2017 года — 102,5 %.

Базавы індэкс спажывецкіх цэн, які выключае змяненне цэн на асобныя тавары і паслугі, схільныя да ўплыву фактараў адміністрацыйнага і сезоннага характару, у сакавіку гэтага года ў параўнанні з лютым склаў 100,5 %, а са снежнем мінулага года — 101,4 %.

Зусім нязначна (на 0,6 %) у сакавіку падаражэлі харчовыя тавары. А вось кошты на нехарчовыя тавары ў мінулым месяцы выраслі на 0,9 % (з пачатку года — на 1,9 %). Больш за ўсё ў сакавіку падаражэлі платныя паслугі — на 1,1 % (з пачатку года — на 4,2 %).

Сяргей КУРКАЧ

■

МАРЫ ПРА ЛІПЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У цэлым пытанне мэтазгоднасці такой работы даволі спрэчнае. Бо папярэдніц гэтых маладых ліп выдалілі не проста так. Вось і апошнія даследаванні паказалі перавышэнне ўзроўню забруджанасці па солях натрыю на праспекце Незалежнасці аж у 68 разоў. Агляды выявілі: пупышкі на большасці дрэў, што растуць уздоўж праезнай часткі, спаліла соль, якая на іх асядала. Зараз такія галінкі прыйдзецца выдаліць, а потым чакаць, калі прачнуцца новыя пупышкі. Акрамя таго, наяўнасць солі ў глебе перашкаджае засваенню вільгаці раслінамі, вядзе да парушэння фізіёлага-біяхімічных працэсаў і наступнага аслаблення. Нават калі дрэва паліта, яно не можа атрымаць вільгаць з глебы і перманентна адчувае засуху.

Як растлумачыў **загадчык сектара маніторынгу расліннага свету Інстытута эксперыментальнай батанікі імя Купрэвіча Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр СУДНІК**, уздзеянне чалавека на навакольнае асяроддзе бывае некалькіх тыпаў. Прамы ўплыў — высечка, абрэзка, будаўнічыя работы, ушчыльненне глебы, механічнае пашкоджанне каранёў, кроны, ствалоў дрэў і іншае. І ўскоснае, звязанае са змяненнем асяроддзя, — адсутнасцю дастатковай вільгаці, забруджваннем глебы і паветра. Тыпаў уздзеяння некалькі, аднак вынік часцей за ўсё адзін: пашкоджанні дрэў розной ступені цяжкасці.

Адна з галоўных умоў выбару роду і віду дрэў для высадкі ў гарадскім асяроддзі — здольнасць захоўваць нармальную жыццядзейнасць, нягледзячы на прысутнасць у атмасферы шкодных газаў. Усе тры роды найбольш распаўсюджаных у сталіцы дрэў — ліпа, клён, каштан — валодаюць гэтай уласцівасцю. Значна складанейшая сітуацыя з солеўстойлівасцю. У зімовы перыяд у нашай краіне дарогі апрацоўваюць тэхнічнай соллю, якая практычна цалкам складаецца з хларыду натрыю, выкарыстоўваючы яе альбо ў чыстым выглядзе, альбо ў сумесі з пяском у суадносінах 1:1. Яе перавага — нізкі кошт. Але фінансавая эканомія з лішкам кампенсуецца моцным негатыўным уздзеяннем на навакольнае асяроддзе. Асеўшы на ігліцы і парастках соль выклікае іх абязводжванне, а пры пранікненні ў тканкі — пашкоджанне. У ліку магчымых наступстваў — солевыя апёкі, змяненне структуры расліны, адставанне ў росце і развіцці, некроз ігліцы і ліста, іх заўчаснае ападзенне.

Ад карысці да шкоды — адзін крок

Не толькі непасрэдна шкодныя рэчывы наносяць страты зялёным насаджэнням, не менш пагібельнай праяўляе сябе, здавалася б, такая пазітыўная з'ява, як развіццё гарадской гаспадаркі. Будаўнічыя работы, якія праводзяцца ў непасрэднай блізкасці ад дрэва, — непазбежны фактар рызыкі для яго. Часта пры пракладцы трас камунікацый, выкопванні катлаванаў і траншэй, рамонце і будаўніцтве дарог, брукаванні дарожак і падсыпцы грунтоў пашкоджваецца каранёвая сістэма. Складаванне будматэрыялаў, устаноўка бытовак і заезд цяжкай тэхнікі ўшчыльняюць глебу да крытычнага стану. Каранёвым лапам, ствалам і галінам дрэў, хай і выпадкова, наносяцца раны. Кожнае такое пашкоджанне адмоўна ўплывае на стан дрэва. Калі за кароткі час пашкоджанняў здарыцца некалькі, то стан дрэва пагаршаецца. Саслабленае ў выніку ненаўмыснага ўздзеяння чалавека дрэва лёгка становіцца аб'ектам нападу шкоднікаў і патагенных арганізмаў.

Расшырэнне дарог, накіраванае на стварэнне камфортных умоў для аўтамабілістаў, прыводзіць да таго, што дрэвы аказваюцца ў непасрэднай блізкасці ад праезнай часткі. Хоць па нарматывах адлегласць ад палатна дарогі да ствала дрэва павінна быць не менш, чым 2,1 метра. Аднак горадабудаўнікам гэтыя прадпісанні здаюцца не надта істотнымі і нарматывы часта прыносяцца ў ахвяру зручнасці. Калі дрэвы пасаджаны ў два рады, то розніцу паміж імі заўважыць любы, нават не біёлаг. Дрэвы, якія растуць уздоўж дарогі, будуць значна больш пашкоджаныя. Напрыклад, тыя самыя ліпы, род, які валодае высокай газаўстойлівасцю: першы шэраг — дрэвы з высахлым лісцем, якія пакутуюць ад розных пашкоджанняў і хвароб, другі шэраг — вонкава здаровыя экзэмпляры з зялёнай кронай.

Яшчэ адзін значны фактар, акрамя адлегласці ад праезнай часткі, — памеры лункі, у якую высаджваецца дрэва. Адлегласць ад ствала дрэва да краю лункі павінна быць не менш за метр, што, вядома, вялікая рэдкасць ва ўмовах шчыльнай забудовы вялікага горада. А тым больш галоўнага праспекта.

Дарэчы, зялёныя насаджэнні пакутуюць не толькі ад хімічных пашкоджанняў, але і ад механічных. Ручныя косы ў сталічнай гаспадарцы ўжо практычна цалкам выцесненыя трымерамі, якія, хоць і значна больш хуткія, аднак менш «манеўраныя», таму падчас пакосу дрэвы часта становяцца ахвярамі іх неакуратнага выкарыстання. У памяць пра гэта на ніжняй частцы ствала застаюцца і доўга не загойваюцца «шнары».

Застаецца верыць, што пасаджаным на праспекце ліпам удасца пазбегнуць лёсу сваіх папярэдніц. Толькі ўявіце гэты шум прыгожых, здаровых дрэў у самым цэнтры горада. Мара?

Дар'я КАСКО.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

БРЫГАДА ЗАКАНЧВАЕ МАРШ

Ва Узброеных Сілах Беларусі працягваецца праверка, распачатая па даручэнні Прэзідэнта. Нагадаем, што падчас яе з запасу былі прызваны каля 2 тысяч ваеннаабавязаных. У гэтыя дні брыгада з імі завяршае марш у раён сканцэнтравання.

— Упершыню з моманту стварэння 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады яна была адмабілізавана і прыведзена ў баявую гатоўнасць, — зазначыў міністр абароны Андрэй Раўкоў падчас выязнога пасяджэння «Дэпутацкага клуба» ў гэтым злучэнні. — Сёння брыгаду чакае агляд гатоўнасці да выканання задач. Неўзабаве прызваныя з запасу вернуцца дадому.

Тое, як прайшла праверка, яшчэ стане прадметам глыбокага аналізу. Але, па словах Андрэя Раўкова, папярэднія вынікі дэманструюць здольнасць войскаў прывесці сябе ў стан поўнай баявой гатоўнасці і выканаць пастаўленыя перад імі задачы. Самі ж праверкі боегатоўнасці праходзяць пастаянна. Яны ахопліваюць шмат аспектаў — ад прызыву ваеннаабавязаных да забеспячэння неабходнымі рэсурсамі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

СУАЙЧЫННІКІ ТРАПІЛІ Ў АВАРЫЮ

У выніку ДТЗ у Пскоўскай вобласці пацярпелі шэсць беларусаў.

Па інфармацыі прэс-службы рэгіянальнага ўпраўлення МУС па вобласці, каля пяці гадзін раніцы на 258-м кіламетры аўтадарогі Санкт-Пецярбург — Невель у Струга-Красненскім раёне адбылася аварыя, у выніку якой шэсць чалавек атрымалі траўмы розной ступені цяжкасці. Мяркуецца, што кіроўца трактара «Вольва» пры развароце не ўпэўніўся ў бяспецы манеўру, з прычыны чаго адбылося сутыкненне з аўтамашынай «Мерседэс».

У мікрааўтобусе знаходзіліся дзевяць грамадзян Беларусі. Па апошняй інфармацыі, тры чалавекі шпіталізаваны з пераломамі і іншымі траўмамі, тры — з ударамі і рванымі ранамі — праходзяць лячэнне амбулаторна.

ЛАВІЛІ ШЧУПАКОЎ «ПАВУКОМ»...

На возеры ў Жыткавіцкім раёне работнікі Любанскай міжрайінспекцыі затрымалі траіх жыхароў суседняга Салігорскага раёна, якія лавілі шчупакоў пад'ёмнікам («павуком»).

Парушальнікі «рыбачылі» каля помпавай станцыі, дзе рыба ідзе на свежую ваду. Незаконны ўлоў — 91 асобіна шчупака вагой 65 кілаграмаў — абыдзецца ім у 20 тысяч рублёў. Распачата крымінальная справа, паведамілі ў Дзяржінспекцыі.

60 асобін шчупака вылавіў двума кошыкамі з металічнай сеткі жыхар вёскі Дубінка Гродзенскага раёна. Мужчына браканьернічаў забароненымі прыладамі на рацэ Яжовіца, там яго і затрымалі дзяржінспектары. Вага незаконнага ўлову — амаль 20 кілаграмаў, прычыненая прыродзе шкода ацэньваецца ў 13 230 рублёў.

З 43-метровай сеткай выйшлі на ваду двое жыхароў вёскі Чухава Пінскага раёна. На вадасховішчы Пагост яны вылавілі 14 шчупакоў вагой сем кілаграмаў і пяць асобін рыбы іншых відаў. Гэтага было дастаткова, каб шкода перавысіла 100 базавых велічынь, бо падчас нерасту яна вылічаецца ў трайным памеры. Мужчыны ўжо пакрылі 3,5 тысячы рублёў за незаконна здабытую рыбу, тым не менш іх могуць прыцягнуць да крымінальнай адказнасці.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Маральна-этычныя калізіі

«НЕ ЗАБІРАЙЦЕ ОРГАНЫ НА НЕБА...»

Кожны з нас можа стаць як патэнцыйным донарам, так і рэцыпіентам

Дзесяць гадоў таму, у ноч з 2 на 3 красавіка, на базе 9-й мінскай клінічнай бальніцы была здзейснена першая ў гісторыі айчыннай медыцыны перасадка печані. Менавіта гэта аперацыя стала адпраўным пунктам для імклівага развіцця айчыннай транспланталогіі. Калі ў 2008 годзе беларускімі спецыялістамі было трансплантавана 37 донарскіх органаў, то ў 2017 годзе — ужо 502.

Кіраўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак Алег РУМО запэўнівае: беларускія медыкі здольныя выканаць абсалютна любую аперацыю па трансплантацыі органаў, якая існуе ў свеце. Аднак транспланталогія — фактычна адзіная галіна ў медыцыне, якая не можа развівацца без удзелу грамадства, у прыватнасці без яго падтрымкі. Абавязковая ўмова — наяўнасць донарскіх органаў: няма іх — няма і трансплантацый. А ў спецыялістаў, якія займаюцца выратаваннем чужога жыцця, павінна быць упэўненасць, што грамадская думка — на іх баку.

Этычныя праблемы, якія цягне за сабой развіццё транспланталогіі, аказаліся ў цэнтры ўвагі міжнароднай канферэнцыі «10 гадоў трансплантацыі печані ў Рэспубліцы Беларусь», арганізаванай Міністэрствам аховы здароўя і Аддзелам па біяэтыцы Савета Еўропы пры падтрымцы Інфармацыйнага пункта Савета Еўропы ў Мінску.

Падарыць выратаванне... А каму?

Але спачатку крыху гісторыі. Узнікненне і развіццё біяэтыкі ў другой палове XX стагоддзя было выклікана грандыёзнымі змяненнямі ў тэхнічным і тэхналагічным пераўзбраеннях медыцыны, поспехамі геннай інжынерыі, з'яўленнем біятэхналогій, тэхнічнымі магчымасцямі транспланталогіі і штучнага падтрымання жыцця пацыента, які памірае. Калі ў 1962 годзе ў бальніцы горада Сіэтла (штат Вашынгтон) з'явіўся першы апарат «штучная нырка», урачы аказаліся перад складанай праблемай: як устанавіць чаргу ў падключэнні да апарата, бо, выратоўваючы адных, тым самым урачы пазбаўлялі надзеі на выжыванне іншых сваіх пацыентаў. Медыкі вырашылі, што яны не маюць маральнага права ўстанаўліваць чарговасць доступу да апарата, і прапанавалі стварыць камітэт з паважаных грамадзян, які б і вырашаў, каму падарыць магчымасць выратавання. Журналісты ахрысцілі яго ў прэсе «божым камітэтам». Па сутнасці, гэта быў першы ў гісторыі чалавецтва этычны камітэт. Традыцыйна менавіта ўрачы вырашалі пытанні жыцця і смерці каля ложка пацыента, а ў Сіэтле стала зразумелым, што доступ да апарата «штучная нырка» — гэта не толькі медыцынская, але і маральная праблема і для яе вырашэння недастаткова толькі ўрачэбных ведаў і вопыту.

Тэрмін «біяэтыка» прапанаваў у 1970 годзе амерыканскі анколаг Ван Рэнселер Потэр, які прадвызначыў яе як «мост у будучыню» і заклікаў прадстаўнікоў гуманітарных навук, біёлагаў і ўрачоў аб'яднаць намаганні для таго, каб захаваць будучыню для чалавецтва. Галоўнае, каб кожны вучоны і даследчык кіраваўся сацыяльнай адказнасцю, паколькі наступствы навукова-тэхнічнага прагрэсу могуць быць вельмі сур'ёзныя і далёка не заўсёды бяспечныя для людзей. Найважнейшая задача, якая ставіцца перад біяэтыкай, — спрыяць выяўленню розных пазіцый па найскладанейшых маральных праблемах, якія лавінападобна цягне за сабой прагрэс біямедыцынскай навукі і практыкі. Выдзяляюцца чатыры асноўныя прынцыпы біяэтыкі: прынцып павагі да чалавечай годнасці, прынцып «рабі дабро і не рабі зла», прынцып прызнання аўтаноміі асобы і прынцып справядлівасці. Правілаў таксама чатыры: праўдзівасць, канфідэнцыяльнасць, недатыкальнасць прыватнага жыцця і добраахвотная інфармаваная згода. У сукупнасці яны ўтвараюць этычныя каардынаты, якія прымушаюць бачыць у пацыенце ў першую чаргу асобу, а не аб'ект для назірання, эксперыментавання і маніпулявання.

У лісце чакання...

— Трансплантацыя для многіх пацыентаў застаецца адзіным шанцам на выратаванне, — канстатуе **кансультант па медыцынскіх прадуктах і чалавечых органах Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Нунес ХАСЭ.** — У Еўрасаюзе летась было праведзена амаль 32 тысячы трансплантацый, але ў лісце чакання знаходзяцца 64 тысячы чалавек (удвая больш), і, на жаль, больш чым 3700 пацыентаў памерлі, так і не дачакаўшыся донарскага органа. У ЗША зарэгістравана 122 тысячы чалавек, якім патрабуецца трансплантацыя, кожныя 10 хвілін да іх дадаецца яшчэ адзін чалавек і 20 чалавек штодня паміраюць. А далей сітуацыя будзе толькі пагаршацца, таму што ныркавая недастатковасць прагрэсіруе ва ўсім свеце. Зараз больш як два мільёны чалавек прыкаваныя да апарата «штучная нырка»...

Відавочна, што патрэба ў донарскіх органах намнога большая, чым колькасць здзейсненых перасадак. Гэтым тлумачацца такія з'явы, як донарскі турызм і нелегальны гандаль чалавечымі органамі. У бедных краінах свету людзі свядома прадаюць свае органы, каб пракарміць сям'ю. Мігранты такім чынам спрабуюць зарабіць грошы, каб перасекчы Міжземнае мора. Ёсць інфармацыя, што кожны тыдзень у Каіры і на тэрыторыі Турцыі выконваецца ад 8 да 10 нелегальных трансплантацый нырак. Такія аперацыі робяцца часта ў антысанітарных хатніх умовах, літаральна на падлозе, і здараецца, што гінуць і донар, і рэцыпіент.

У планах Сусветнай арганізацыі аховы здароўя — зацвердзіць пашпарт рэцыпіента і донара: ён будзе ўяўляць сабой картку з літарна-лічбавым кодам, указаннем тыпу донара, яго краіны паходжання, медыцынскай установы, дзе была зроблена трансплантацыя, і іншай важнай інфармацыяй. Інжынеры вырашылі, што найбольш эфектыўнай будзе тэхналогія блокчэйн. Мяркуецца, што гэта мера дазволіць зрабіць транспланталогію больш празрыстай і застрахуе ад злоўжыванняў і крыміналізацыі. У Глабальнай базе даных па трансплантацыі Сусветная арганізацыя аховы здароўя мае намер сабраць інфармацыю па донарстве і трансплантацыі органаў, тканак і клетак з усяго свету.

Львоф ЛОРАНС, кіраўнік Аддзела па біяэтыцы і сакратар Камітэта па біяэтыцы Савета Еўропы, звяртае ўвагу на важнасць даверу з боку грамадства да дзейнасці службы транспланталогіі. Яшчэ ў 1997 годзе Саветам

Еўропы была прынятая Канвенцыя аб правах чалавека і біямедыцыне. А з 2006 года дзейнічае дадатковы пратакол, які вызначае ўмовы атрымання органаў і тканак і іх размеркавання, а таксама выкананне кодэкса добрасумленных тэхнічных і медыцынскіх практык.

Прэзумпцыя згоды

І хоць наша краіна да канвенцыі і пратакола пакуль не далучылася, Закон Рэспублікі Беларусь «Аб трансплантацыі органаў і тканак чалавека» лічыцца адным з самых прагрэсіўных законаў. У яго аснову была пакладзена прэзумпцыя згоды. Гэта азначае, што калі пры жыцці чалавек не выказаў пэўнага стаўлення да выкарыстання сваіх органаў пасля смерці для трансплантацыі хвораму чалавеку, значыць, ён дае згоду на донарства. Тым, хто не падтрымлівае прэзумпцыю згоды і не хоча аддаваць свае органы пасля смерці, забяспечваецца магчымасць выказаць сваё жаданне пры жыцці, пры гэтым сваякі маюць права выказаць волю памерлага і забараніць адбіраць яго органы пасля наступлення смерці. У шэрагу еўрапейскіх краін (Аўстрыя, Бельгія, Францыя, Польшча, Фінляндыя, Венгрыя, Чэхія і г. д.), як і ў Беларусі, практыкуецца абсалютная мадэль прэзумпцыі згоды. І менавіта там актыўнасць транспланталогіі значна вышэйшая.

Стаўленне да донарства ў значнай ступені залежыць і ад рэлігійных поглядаў. Між іншым, усе вядучыя канфесіі свету ў прынцыпе ўхваляюць гэты метад лячэння смяротным донарам, прырастае на 45—50 чалавек. Але разам з тым... хтосьці з прынцыповых праціўнікаў донарства з'язджае, хтосьці памірае, а некаторыя заявы анулююцца.

«Кожнаму з нас зусім не пашкодзіць задумацца: а ці застрахаваны мы ад таго, каб таксама не трапіць у ліст чакання людзей, жыццё якіх залежыць ад трансплантацыі і пошуку донарскага органа?»

— Тая акалічнасць, што грамадзяне сталі адклікаць свае заявы, нас вельмі радуе. Па гэтым індыкатары можна ацэньваць ступень чалавекалюбства, — падкрэслівае кіраўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак Алег Румо. — Трансплантацыя — надзвычай складаная сфера ў плане захавання даверу, этыкі і маралі. І маральна-этычных праблем становіцца ўсё больш. Напрыклад, ёсць два пацыенты, адзін з якіх знаходзіцца ў вельмі цяжкім стане, і мае нізкі рэабілітацыйны патэнцыял. Дык, можа, лепш аддаць донарскі орган чалавеку, які пасля аперацыі пражыве 20—30 ці нават больш гадоў, створыць сям'ю, народзіць дзяцей? Таксама ўзнікаюць пытанні з выкананнем трансплантацый хворым са злаякаснымі паражэннямі печані, таму што такія пацыенты жывуць крыху менш, чым пацыенты з іншымі паказчыкамі для трансплантацыі. Заўсёды на шалях знаходзяцца пытанні клінічнай эфектыўнасці і сацыяльнай справядлівасці.

У Беларусі распрацавана адмысловая камп'ютарная праграма, якая дазваляе цалкам выключыць уплыў чалавечага фактару пры размеркаванні донарскіх нырак для трансплантацыі. Праграма робіць адбор зыходзячы з двух прынцыпаў — прыярытэтнасці і клінічнай эфектыўнасці. Эфектыўнасць мае на ўвазе не проста выкананне аперацыі, а забеспячэнне добрай якасці жыцця пасля яе і доўгае функцыянаванне перасаджаных органаў.

На заканадаўчым полі

Цэлы спектр маральных і юрыдычных праблем узнікае ў сувязі з заборам і перасадкай органаў і тканак ад памерлых донараў. Іх выкарыстанне стала магчымым пасля таго, як быў узаконены такі крытэрый смерці, як «смерць мозга». Справа ў тым, што пасля наступлення смерці мозга на працягу некалькіх дзён можна штучна падтрымліваць вегетатыўныя функцыі ў арганізме, у прыватнасці работу сэрца, лёгкіх, печані. Для дыягностыкі гібелі мозга распрацаваны спецыяльны алгарытм дзеянняў, які прадугледжвае выкарыстанне комплексу клінічных і апаратных метадаў дыягностыкі. Памылка цалкам выключаецца.

— Па нашых звестках, кожны год у стацыянарах паміраюць пяць мільёнаў чалавек, з іх паўмільёна — у палатах інтэнсіўнай тэрапіі і з'яўляюцца патэнцыйнымі пасмяротнымі донарамі. Калі мы зможам хоць бы 300 тысяч ператварыць у рэальных донараў, то атрымаем больш за мільён донарскіх органаў (на кожнага памерлага донара прыпадае ў сярэднім па 3,5 органа), што забяспечыць пакрыццё рэальных патрэб у трансплантацыі, — падкрэслівае Нунес ХАСЭ. — У Харватыі, напрыклад, пасля аптымізацыі сістэмы ўліку смерці мозга ў пацыентаў колькасць донарскіх органаў павялічылася ўдвая.

Між іншым, сёлета ў наш парламент плануецца ўнесці папраўкі ў закон «Аб трансплантацыі органаў і тканак чалавека». У прыватнасці, прапануецца пашырыць круг жывых донараў, якія будуць ахвяраваць органы на бязвыплатнай аснове.

У некаторых заходніх краінах існуе такая практыка, як перакрыжаванае донарства. Гэта магчыма ў тым выпадку, калі чалавек хоча ахвяраваць сваяку орган, а той яму не падыходзіць. У той жа час зусім у іншага чалавека таксама ёсць сваяк, якому неабходны орган, але ён таксама не падыходзіць. У гэтым выпадку ажыццяўляецца бязвыплатны парны абмен. У Беларусі па заканадаўстве гэта пакуль не дазволена.

Акрамя таго, прапануецца заканадаўча замацаваць магчымасць і ўмовы міжнароднага супрацоўніцтва ў рамках тых ці іншых аб'яднанняў: каб усё было празрыста, законна і ўзаемавыгадна. У 2017 годзе Беларусь ужо стала паўнавартасным членам міжнароднай супольнасці па абмене органамі для трансплантацыі Foedus.

Надзея НІКАЛАЕВА

Сямейная газета

Выпуск № 7 (98)

ПАНАДКУСАНЫЯ ЯБЛЫКІ

У хрушчоўцы, дзе я зараз жыву, распачаўся капітальны рамонт. Таму апошнія два месяцы ўвесь наш пад'езд пакутуе без газу. За гэты час я адкрыла для сябе шмат новых бістро, сталовак і піцэрый паблізу з месцам працы і домам. Не абышлося і без расчаравання. На днях завітала ў адну з «мажорных» кавярняў. У абедзенным меню ўгледзела свой любімы гарохавы суп. Але ў першай жа лыжцы мяне чакаў сюрпрыз. Кавалачак металічнай ніткі, падобны да тых, з якіх робяць мачалкі для чысткі патэльні. Я з міскай супу і сваёй нечаканай знаходкай падышла да афіцыянткі. Тая тут жа паклікала кухарку. Жанчына гадоў сарака пакруціла ў руцэ маю знаходку і выдала: «Дзяўчына, у нас такіх няма! Розуму не дабяру, дзе вы яе ўзялі». І пасля гэтых слоў кінула жалезку на падлогу. У гэты момант з кухні выйшаў малады мужчына, як пасля высветлілася, гаспадар той кавярні... Ён вярнуў мне грошы за суп разам з выбачэннямі і абяцаннем больш такога не дапусціць... Я ж усё думала пра тую кухарку і пра тое, што большасць людзей не ўмее прызнаваць сваю віну. Адразу ж па інерцыі спрабуюць спіхнуць яе на іншага...

Трохгадовы Алесь носіцца па кватэры, крычыць і кідаецца ў гасцей цацкамі. Урэшце спатыкнуўся аб машынку і са слязамі накінуўся на Жэньку, што стаяў побач: «Гэта ўсё з-за цябе, кінуў мне яе пад ногі». Хоць некалькі хвілін таму зрабіў гэта сам. Кажу яго тату, маўляў, звярні ўвагу. Алесь яшчэ такі малы, а ўжо сваю віну на іншых перакладае. На што чую ў адказ: «Што тут зробіш. У садок жа пайшоў. А там дзеці яшчэ і не таму навучаць». Пасля гэтых слоў мне не захацелася больш нічога тлумачыць. Недарэмна кажуць, яблынька ад яблыні...

З гэтай нагоды прыгадалася даволі жорсткая інгушская прытча.

Хлопчык украў у суседскім садзе некалькі яблыкаў і прынёс дадому. Бацька пахваліў малога. І года не прайшло, як сын ужо прынёс украдзеную курыцу. Затым прывёў чужую карову. І кожны раз атрымліваў пахвалу ад бацькі. Ішлі гады, і малады чалавек стаў сапраўдным злодзеем. Аднойчы ён вырашыў прысвоіць казну знакамітага князя, але яго злавілі. Хлопца чакала смяротнае пакаранне. Суддзя даў злодзею апошняе слова, і той сказаў:

— Вось там сядзіць мой бацька, які заахвочваў мяне да крадзяжу, своечасова не спыніў. На ім столькі ж віны, колькі і на мне.

Калі суддзя пераканаўся, што малады чалавек кажа праўду, ён памяняў сваё рашэнне. Наказаўшы хлопцу больш не красці, адпусціў яго, а бацьку прыгаварыў да смяротнага пакарання.

У мяне дома вісіць малюнак мастачкі Вікторыі Кірдзій. На ім непасрэдная вавёрка, якая панадкусвала цэлую кучу яблыкаў. Шкада, калі бачу яе, успамінаю дачушку сваёй знаёмай. Неяк я зайшла да іх у госці. Сядзім, размаўляем. Раптам у пакой забягае Аленка з двума вялікімі яблыкамі ў руках. Сяброўка з усмешкай спытала сваю маленькую прынцэсу: «Мілая, ты не магла б даць сваёй мамачцы адзін з двух яблыкаў?» Дзяўчынка паглядзела на маму і хуценька надкусіла адзін яблык, затым другі. Усмешка застыла на твары сяброўкі, яна вельмі старалася не паказаць сваё расчараванне. Я таксама паспела расстроіцца... І раптам дзяўчынка працягнула адзін з укушаных яблыкаў і сказала: «Мамачка, вазьмі вось гэты, ён больш салодкі».

Гэта быў чарговы ўрок... для мяне таксама. Ніколі не варта спяшацца судзіць іншых. Дайце ім магчымасць растлумачыць.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

■ Тыя, хто побач

НЯЗОРНАЕ ЖЫЦЦЁ МАМЫ КАСМАНАЎТА

Валянціна НАВІЦКАЯ — пра грэх, зайчыкаў ласунак ды нечаканы падарунак

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Пасля першага палёту сына ў космас Валянціна Эдуардаўна пасадзіла каля дома тры туі. Яны растуць і нагадваюць ёй пра дзяцей: Алега, Марыну і Дзмітрыя.

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

■ Быць разам

СПЕКТАКЛЬ ДЛЯ ЖОНКІ,

або Ігра ў чатыры рукі

З творчай сям'ёй СІНІЦАЎ я пазнаёмілася на адным з дзіцячых тэатральных фестываляў. Там тата з сынам прыемна здзівілі спектаклем «Брыдкае птушаня» па матывах казкі Ганса Крысціяна Андэрсена. Што ў іх пастаноўцы такога незвычайнага? Па-першае, любімая многімі з дзяцінства гісторыя, дзякуючы ParadoxPinoccio *(так называецца сямейны тэатр Сініцаў. — Аўт.)*, загучала па-беларуску. Па-другое, пастаноўка зроблена ў надзвычай таямнічым жанры — тэатр ценяў. Па-трэцяе, усе прыгоды галоўнага героя адбываліся пад неверагодна прыгожую музыку італьянскага кампазітара Ніна Рота.

СЮЖЭТ Андэрсена Стас крыху трансфармаваў. Дадаў у яго крыху рамантыкі. Так, брыдкаму птушаняці пашчасціла сустрэць на сваім шляху такую ж дзіўную і ні да кога не падобную, як ён сам, істоту. Яны пачынаюць разам гуляць, весяліцца. І паміж імі ўзнікае першае дзіцячае каханне. Праўда, у нейкі момант з'яўляюцца лебедзі і забіраюць «дзяўчынку» з сабой у вырай. Брыдкае птушаня пачынае нудзіцца, з горам папалам перажывае сцюдзёную зіму. Але прыходзіць вясна, і яго каханая, якая за гэты час выросла і ператварылася ў прыгожую лябёдку, вяртаецца. Ён плыве да яе насустрач па возеры са словамі: «Якая ж ты прыгожая! А я... такі брыдкі...». У роспачы апусціў уніз галаву і не паверыў сваім вачам — з воднага люстэрка на яго пазіраў статны лебедзь.

— Спектакль прысвечаны маёй жонцы Тані, — усміхаецца Стас. — Гэта ў нейкім сэнсе нават асабістая гісторыя. Яна зашыфраваная ў пастаноўцы. Для мяне асабіста тэма, узнятая Андэрсенам, вельмі блізкая, актуальная.

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

Пасылка

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Здымак носіць ілюстрацыйны характар.

«ДАРУСЬКА, донька, ты адабрала роўненькую? Сярэднюю? Глядзі, я праверу», — так пытаўся ў сваёй меншай дачкі бацька, які дабіваў скрынку з фанеры. Гаворка ішла пра бульбу для пасылкі. Яна рыхтавалася для старэйшай Анюты, якая разам з аднакласніцамі пасля заканчэння дзесяцігодкі першай з дзяцей у сям'і паехала з дому — завербавалася «аж на Данбас».

Маці Дарынкі, гаворачы пра гэтую паездку, бедкалася суседкам: «Паехала мая донька ў белы свет, як у капейку. Нібы тая птушка з гнязда, паляцела з бацькоўскага дому ў вырай».

На двары быў 1960 год. Бацькі раз на месяц адпраўлялі сваёй старэйшай дачцэ бульбяныя пасылкі. Радзей перасылалі і іншыя: з сушанымі грыбамі, чарніцамі, садавіной, арэхамі-лузанцамі, уюнамі. Іх дарослыя разам з меншымі дзецьмі нарыхтоўвалі для ўсёй сям'і ўволю, бо пасёлак, у якім жылі, з усіх бакоў быў акружаны балотамі і лясамі, якія проста кішэлі прыроднымі дарамі. Хто не ленаваўся, у таго былі поўныя скрыні гэтага, прыродай дадзенага, дабра.

Але бульбяныя пасылкі былі галоўнымі, абавязковымі і на асобым бацькоўскім уліку.

Дарынка ў падполлі старанна адбірала бульбу для сястры. Спачатку адклала ўбок самыя вялікія клубні, думаючы, што з іх Анюта там далёка, куды заехала, надзярэ дранікаў (Маці ж заўсёды наказвала ёй на дзеруны набіраць буйную бульбу — яе лепш трымаць у руцэ і драць на тарцы.) Але прыйшлося тыя вялікія клубні назад высыпаць — для пасылкі патрэбны былі невялічкія, каб больш змясцілася. Сапучы, Дарынка зноў апусцілася ў падполле. Яна не разумела, як гэта можна ехаць «у капейку»? Яна ж такая маленькая! А ў вырай? Гэта ж птушкі ляцяць у той вырай, а як яе сястра паляцела, не маючы крылаў? І што гэта за мода такая з'язджаць ад бацькоў кудысьці, дзе няма нават бульбы? Чаго тады туды ехаць? А што есці? А колькі той бульбы ў маленькай скрынцы? На колькі яе хопіць? Ды тут на адзін зуб, як кажа яе старэйшы брат, калі да яго рук трапляе штосьці смачнае і патрэбна дзяліцца з іншымі. Праўда, тут жа і дзеліцца.

— Паперлася на край свету. Чаго, якой хваробы? — бубнячы сабе пад нос, як гэта рабіла старэнькая Дарынчына бабуля Ганна, дзяўчынка падняла наверх кошык з роўненькай, «сярэдняй» бульбай.

— Ну во, такая як трэба! Малайчына! Што ты там бубніш? Падымі рукі, — бацька нагнуўся і пад рукі выхапіў наверх з падполля дачку, паставіў яе каля стала, закрыў-апусціў на месца дзве дошкі (адну з вечкам), якія служылі накрыўкай хатняга пограба. Разам з маці яна пачала ўкладваць у пасылку клубні. Каб бульбіны не стукаліся адна аб адну, не шургацелі ў той скрынцы, кожную абгортвалі кавалкамі старых газет. Падаючы маці клубні, малая думала сваё.

Дарынцы было каля шасці гадочкаў, і куды ёй тады, маляўцы, было ведаць і разумець: і пра «вырай», і пра «ў капейку», і пра моду, а дакладней кажучы час, калі моладзь ехала з маленькіх сёл, пасёлкаў, гарадоў на новабудоўлі, на цаліну. Па сваю долю, па шчасце. Сама яна не збіралася нікуды ад бацькоў ехаць, ёй было і тут добра.

СЯСТРА ж Дарынкі, Анюта, на Данбасе апынулася ў невялікім гарадку, які з усіх бакоў быў акружаны агромністымі гарамі-тэрыконамі выпрацаванай вугальнай пароды. Гэта быў шахцёрскі край і панавалі тут яго вялікасць — Вугаль і яго здабытчык — Шахцёр. Панавалі ў тым сэнсе, што былі яны тут ва ўсім на першым месцы. Усё, што было ў тым гарадку, як і ў дзясятка іншых, падобных гэтаму, круцілася-вярцелася вакол шахтаў — яны давалі велічэзнай дзяржаве адборны вугаль.

Але тая зямелька, такая багатая на «чорнае золата», была зусім непрыдатнай для вырошчвання іншага падземнага скарбу — бульбы. У іх гарадку, які якраз размяшчаўся-раскінуўся на велічэзных запасах-пластах «антрацыту» — самага лепшага па якасці каменнага вугалю, бульба была на вагу золата. Шахты, тэрыконы, вугальная пылота. Яна была паўсюдна і называлася тут «штыбам». Якая ж бульба ці іншая гародніна будзе расці на спрасаваным штыбе? Так што ў крамах і на кірмашы ўсё было прывазное, а значыць, дарагое. На маленькі заробак вучаніцы майстра-аддзелачніка сталярнага цэха не вельмі разгонішся. А яшчэ ж кут нейкі аплачваць патрэбна было.

Пасылкі з дому былі вялікай падмогай. Асабліва бульбяныя.

Больш за ўсё карэннай «бульбашцы» хацелася бульбы. Да яе яна звыкла дома, бо ні адзін дзень у іх хаце не абходзіўся без «барабулі». Дома бульбачка была ў першых стравах, у другіх і нават у дэсертных, якія маці гатавала ў печы і ў грубцы: у чыгунках, горшчыках, на блясе. Чаго толькі яна не ўмудралася нарабіць з яе!?

Асабліва смачнай была бульбяная каўбаса з бляхі. Начынне яе гатавалася так, як для бабкі, але бабка закладвалася ў чыгунок або горшчык, а тут, надзёртая і запраўленая смажанкай, бульба залівалася-запіхвалася ў свіныя кішкі і потым ужо запякалася ў печы. Смак быў — не перадаць! Незвычайны! Ён запомніўся на ўсё жыццё.

Як даўно гэта было...

Паміраючы, бацькі наказалі малодшаму з сыноў вярнуць «шукачоў лепшай долі» (чацвярых з пяці сваіх дзяцей, якія за прыкладам старэйшай дачкі пакінулі дамоўку і паехалі за свет вочы, у тым ліку і Дарына) дадому — у Беларусь. Малодшы, які нікуды не паехаў з бацькоўскага дому (хіба толькі для вучобы ў ВНУ адлучыўся на пяць гадкоў, ды на службу ў армію — на год), а жыў і працаваў у сваім раёне, затым — вобласці, ля бацькоў (і нават з-за іх адмовіўся ў свой час ад высокай пасады ў Мінску), вуха ў вуха выканаў бацькоўскую волю — вярнуў братоў і сясцёр да роднай зямелькі. Толькі ўжо не адных, а з дзецьмі, унукамі. А тыя рады-радзёшанькі былі гэтаму і самі, бо да таго часу ўжо не было Саюза, усё цяжэй стала дабірацца дадому, на Бацькаўшчыну, на магілы бацькоў...

ДАРЫНА Васілеўна (а для старэйшых братоў і сястры — усё тая ж маленькая Дарынка), сівенькая, як і яе старэйшая сястра, і такая ж, як яна, пенсіянерка, дапамагаючы перабіраць бульбу, якую яны разам вырасцілі на сотках пры бацькоўскай хаце, штосьці ўспомніўшы, паглядзела на старэйшую:

— Анюта, а ты памятаеш пасылкі з бульбай з дому?

— А як жа!

— А на колькі табе хапала адной?

— Дык на месяц расцягвала, эканоміла. На суп, боршч па парачцы, а дранікі ці каму (тоўчанку) толькі ў нядзелю рабіла. А як замуж выйшла, дзеці пайшлі, прыкупляць пачалі. Але купленая не такая смачная была, як з дому.

— Што ты хочаш — свая ж, родненькая, вырашчаная на ўласных латках, расцяробах, палітых потам нашых бацькоў. Яе ж ні з якой іншай не пераблытаеш, — упэўнена заявіла малодшая.

— Твая праўда, сястрычка. Аўжэ ж, свая родненькая — самая смачная, самая дарагая на свеце! — сцвярджальна заківала галавою старэйшая.

Сёстры замоўклі і яшчэ не хутка пачалі гаворку пра іншае. Кожная, адбіраючы-перабіраючы бульбу, успамінала штосьці сваё, з ёю павязанае...

